**Іваноў, К.** Легенды пра буракоўскае балота / К. Іваноў // Сцяг перамогі (Лезна). – 1998. – 25 жн. – С. 4.

## ЛЕГЕНДЫ ПРА БУРАКОЎСКАЕ БАЛОТА

Беларусь наша багатая на мясціны, авеяныя паданнямі і легендамі, што выклікае павагу і гордасць за незвычайнае мінулае роднага краю. Ёсць такія мясціны і ў нас на Лёзненшчыне. Напэўна многія жыхары раёна ведаюць балота, якое знаходзіцца каля вёскі Буракі Кавалёўскага сельсавета. З глыбіні вякоў да нашага часу дайшлі легенды пра гэтую мясціну.

Даўным-даўно, як сведчыць першая легенда, што перадавалася з пакалення ў пакаленне, на месцы сучаснага балота было вялізнае возера, а на беразе яго стаяў прыгожы палац, у якім жыла княжаская сям'я. У князя і княгіні доўгі час не было дзяцей. І вось пасля некалькіх гадоў княгіня нарэшце нарадзіла сына. Хлопчык стаў адзіным наследнікам усяго княжаскага роду. Быў ён усеагульным любімцам і ўцехай для шчаслівых бацькоў.

Аднойчы здарылася вялікае няшчасце – маленькі княжаскі хлопчык утапіўся ў возеры. Гора бацькоў было бязмежным. У адчаі і роспачы княгіня закрычала: «Няхай будзе праклятым навекі гэтае возера!»

Шмат зім і вёсен прайшло з тае пары. І пакутова возера пачало мялець і зарастаць, а з цягам часу ператварылася ў сапраўднае балота.

І яшчэ адна легенда дайшла да нашых дзён пра тое, як гэтае балота выратавала жыхароў навакольных вёсак у вайну 1812 года. Тады праз нашу мясцовасць праходзіў найкарацейшы шлях на Маскву, якую Напалеон хацеў захапіць. Два тыдні летам 1812 года стаялі французскія войскі ў Лёзне. Увесь гэты час яны грабілі і забівалі мірнае насельніцтва. У жыхароў вёсак забіралі прадукты харчавання і фураж.

Каб выратавацца ад акупантаў, жыхары навакольных вёсак, што размяшчаліся каля балота, зрабілі мост і перагналі ўсю хатнюю жывёлу ў непраходнае месца. І самі там схаваліся, а мост разабралі. Французскія салдаты чулі, як мычаць каровы, брэшуць сабакі, але зайсці туды яны не змаглі. Такім вось чынам нашы продкі выратаваліся ад ворага на балоце.

У гады Вялікай Айчыннай вайны ў вёсках Кавалі і Талпа знаходзіўся доўгі час штаб партызанскай брыгады А. Ф. Данукалава. І менавіта цераз гэтае балота партызаны трымалі сувязь з «Вялікай зямлёй», з савецкім тылам.

І ў нашы дні балота спраўна служыць людзям. Шмат гадоў вяліся тут торфараспрацоўкі. Улетку і восенню сюды прыязджаюць многія сяльчане і гараджане па грыбы і журавіны.

**К. Іваноў, настаўнік гісторыі**

**Калышанскай СШ**